УЗГОДНЕНА
Намеснік старшыні Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта
А.С.Мацкевіч
"23" лютага 2026 г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта
Т.М.Кузьма
"23" лютага 2026 г.

**Інструкцыя
аб парадку арганізацыі і правядзення
IX адкрытага рэгіянальнага фестываля-конкурса
эстраднай творчасці дзяцей і моладзі
"Вясёлка талентаў"**

## I. Мэты і задачы.

Адкрыты рэгіянальны фестываль-конкурс эстраднай творчасці дзяцей і моладзі "Вясёлка талентаў" (далей – фестываль-конкурс) ставіць сваёй мэтай садзейнічаць:

- пошуку і рэалізацыі мастацкага патэнцыялу таленавітых дзяцей і моладзі Гродзенскага рэгёна, дапамагаць ім у выяўленні сваіх здольнасцей;
- папулярызацыі эстраднага песеннага жанру;
- павышэнню ўзроўня сцэнічнай культуры і выканальніцкага майстэрства вядзення канцэртных праграм і святочных мерапрыемстваў;
- выхаванню духоўна-маральных каштоўнасцей, патрыятызму ў дзяцей і моладзі пры дапамозе музычных сродкаў;
- абмену творчымі дасягненнямі і магчымасцю ўстанаўлення цесных кантактаў паміж творчымі калектывамі Гродзенскага рэгёна;
- актывізацыі творчай дзейнасці таленавітых дзяцей і моладзі.

Асноўныя задачы фестывалю-конкурсу: арганізацыя вольнага часу дзяцей і моладзі, прыцягненне да ўдзелу ў фестывалях і конкурсах юных талентаў, стварэнне яркай, эмацыянальнай атмасферы свята.

## II. Арганізатары фестываля-конкурса.

- Аддзел культуры Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта (далей – аддзел культуры);
- Дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр" (далей – Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр);
- Азёрскі цэнтр культуры філіял дзяржаўнай установы культуры "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр" (далей - Азёрскі цэнтр культуры).

## III. Парадак правядзення фестываля-конкурса.

Для арганізацыі і правядзення фестывалю-конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт). (Дадатак 1)

Адкрыты рэгіянальны фестываль–конкурс эстраднай творчасці дзяцей і моладзі “Вясёлка талентаў” адбудзецца **30 сакавіка 2026 года** на базе Азёрскага цэнтра культуры, **пачатак конкурсных выступленняў у 11:00**.

Конкурс адкрыты для жыхароў Рэспублікі Беларусь.

Да ўдзелу дапускаюцца творчыя калектывы і асобныя выканаўцы ва ўзросце **ад 5 да 31 года**.

Конкурс праводзіцца ў наступных намінацыях:

- саліст-вакаліст;
- дуэт, або трыа вакалістаў;
- вакальны ансамбль (ад 4 да 8 чалавек);
- канферансье.

**Салісты-вакалісты і вакальныя ансамблі** рыхтуюць **1 вакальны твор** пад фанаграму -1 або acapella. Працягласць выступлення – **не больш 4 хвілін**.

**Канферансье** рыхтуюць самапрэзентацыю і творчы нумар на вольную тэму агульнай працягласцю **да 3 хвілін** і фрагмент вядзення конкурснай праграмы фестываля-кункурса **(тэкст прадастаўляецца арганізатарамі ў дзень выступлення).**

**Узроставыя катэгорыі:**

- ад 5 да 6 год;
- ад 7 да 8 год;
- ад 9 да 11 год;
- ад 12 да 14 год;
- ад 15 да 17 год;
- ад 18 да 24 год;
- ад 25 да 31 года.

Для ўдзелу ў фестывалі-конкурсе неабходна **падаць анлайн-заяўку**.

Анлайн-заяўкі дасылаюцца да **20 сакавіка 2026 года**

https://forms.gle/EcZWofuLVeu1XZkY9

**Канкурсант на электронную пошту дадае копію пашпарта або пасведчання аб нараджэнні, копію квітанцыі аб аплаце, копію дакументаў, падцвярджаючых права на зніжку, копію пісьмовай згоды на апрацоўку асабістых дадзеных, файлы мультымедыа, неабходныя для выступлення (фанаграма, відэакантэнт для дэманстрацыі на экране падчас нумару).**

**Файлы мультымедыа на USB-flash носьбіце, неабходныя для выступлення, у дзень правядзення фестываля-конкурса трэба мець з сабой, а таксама ФОТАЗДЫМАК (фармат 10*15) канкурсанта або калектыва для арганізацыі галасавання на ПРЫЗ ГЛЯДАЦКІХ СІМПАТЫЙ.**

**Арыгінал згоды на апрацоўку асабістых дадзеных абавязкова прадстаўляецца арганізатарам фестываля-конкурса падчас рэгістрацыі (Дадатак 3).**

Фанаграма павінна быць з высокай якасцю гуку ў фармаце **WAV** або **MP3** з частатой дыскрэтызацыі не менш за **44.1 кГц**.

Мультымедыа кантэнт запісваецца ў любым медыа-фармаце. Суадносіны старон кантэнта **16:9 або 4:3.**

Файлы з указаннем узроставай катэгорыі, назвы ансамбля ці прозвішча асобнага выканаўцы і назвы твора, напрыклад: **"7-8 Іваноў Віктар – Краіна дзяцінства"** высылаюцца на электронны адрас фестывалю-конкурсу: **vyaselka-azery.zayvka@bk.ru да 25 сакавіка 2026 года.**

Спіс удзельнікаў конкурсу і парадак выступлення будуць высланы **27 сакавіка 2026 года** на пазначаны ў заяўцы нумар тэлефона кіраўніка.

**Кантактная інфармацыя арганізацыйнага камітэта:**
**230004, г.Гродна, Азёрская шаша, 5**
**231753, Гродзенская вобл., Гродзенскі р-н, аг.Азёры, пл.Леніна, 5**
**Дадатковая інфармацыя па тэлефонах:**
**8(0152) 430032**
**+37529 5849513 (МТС)**

## IV. Умовы правядзення конкурсу і тэхнічнае забеспячэнне:

- Для выступлення канкурсантам прадастаўляецца гукавая апаратура, маніторы, ноўтбук, 8 радыёмікрафонаў, мікрафонныя стойкі.
- Сцэна (працоўная пляцоўка 8м*8м), пакрыццё — дрэва.
- Падчас конкурсных выступленняў выкарыстоўваецца агульнае сцэнічнае святло, на меркаванне светлааператара.
- Не дапускаюцца конкурсныя выступленні пад фанаграму «+».
- Прысутнасць кіраўніка побач з гукарэжысёрам падчас конкурсу выключаецца. За якасць фанаграм аргкамітэт конкурсу адказнасці не нясе.
- Аргкамітэт пакідае за сабой права на складанне конкурснай праграмы і парадку выступлення ўдзельнікаў.
- Рэгістрацыя ўдзельнікаў конкурсу ажыццяўляецца **30 сакавіка з 9:00** і на працягу конкурсу, але не пазней, чым за 1 гадзіну да выступлення,

згодна праграме, у **Азёрскім цэнтры культуры (Рэспубліка Беларусь, Гродзенская вобл., Гродзенскі раён, аг.Азёры, пл.Леніна, д.5)**.

- Грымёрны пакой прадастаўляецца за гадзіну да выступлення і паўгадзіны пасля выступлення (па магчымасці болей).
- За спазненне і ненаведванне конкурснай праграмы аргкамітэт адказнасці не нясе.
- Замена рэпертуару падчас правядзення Конкурсу магчыма толькі па ўзгадненню з аргкамітэтам.
- Узрост асобнага выканаўцы вызначаецца на момант правядзення конкурсу. Узроставая катэгорыя, у якую трапляе ансамбль вызначаецца па ўзросце самага старэйшага ўдзельніка.
- Проба сцэны падаецца ў парадку жывой чаргі толькі з **9:00 да 10:40**. Працягласць рэпетыцыйнага часу **не больш 2 хвілін**.
- **Пры выкананні канцэртнага нумару дапускаецца выкарыстанне бэк-вакала, харэаграфічнага дапаўнення, музычных, тэатральных, цыркавых і іншых мастацкіх элементаў. Удзельнікі гэтых элементаў аплату за ўдзел не ажыццяўляюць.**
- Аргкамітэт не нясе адказнасці за наяўнасць правоў на выкарыстанне заяўленых канкурсантамі твораў.

## V. Фінансавыя ўмовы.

Удзельнікі конкурсу праводзяць аплату за ўдзел у фестывалі-конкурсе ў наступным памеры:

| **Намінацыя** | **Памер аплаты за ўдзел для калектываў і асобных выканаўцаў** |
|---|---|
| Саліст-вакаліст | 40,0 бел.руб. / 1 чал. |
| Дуэт, трыа | 30,0 бел.руб. / 1 чал. |
| вакальны ансамбль (4-8 чал.) | 25,0 бел.руб. / 1 чал. |
| Вядучы | 40,0 бел.руб. / 1 чал. |

Дзецям са шматдзетных сем'яў, дзецям-сіротам, дзецям-інвалідам прадастаўляецца зніжка на ўдзел у конкурсе ў памеры **50%** (да заяўкі дадаецца копія дакументаў, падцвярджаючых права на зніжку).

Аплата за ўдзел у фестывалі-конкурсе ажыццяўляецца на разліковы рахунак аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама **з указаннем прозвішча выканаўцы, або назвы калектыву і паметкай "Вясёлка талентаў".**

**Звяртаем Вашу ўвагу, што банкаўскія камісійныя зборы (%) аплачваюцца за кошт асабістых сродкаў удзельнікаў. Камісійны збор**

**залежыць ад унутранай нарматыўнай дакументацыі банкаўскіх установ. Памер збору не залежыць ад арганізатараў конкурсу. Перад аплатай рэкамендуем удакладніць памер камісійнага збору ў дадзеных установах.**

**РАЗЛІКОВЫ РАХУНАК.**

р/с BY74AKBB 36325140040684000000
Гродненское областное управление №400
ОАО «АСБ Беларусбанк» г.Гродно, ул.Ожешко, 4,
БИК AKBBBY2X
УНП 500027161, ОКПО 02233978

**У выпадку адмовы ад удзелу ў Фестывалі-конкурсе фінансавыя сродкі, якія паступілі на разліковы рахунак, не вяртаюцца.**

## VI. Падвядзенне вынікаў фестывалю-конкурсу і заахвочванне пераможцаў.

Усе ўдзельнікі фестывалю-конкурсу атрымліваюць дыпломы за ўдзел.

Лаўрэаты I ступені ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі атрымліваюць дыплом лаўрэата, кубак фестываля-конкурса і падарунак.

Лаўрэаты II і III ступені ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі атрымліваюць дыплом лаўрэата і кубак.

Узнагароджаныя спецыяльнымі дыпломамі атрымліваюць дыплом і падарунак.

Па выніках фестывалю-конкурсу журы вызначае лаўрэатаў I, II, III ступені ў кожнай узроставай катэгорыі ў наступных намінацыях:

1. саліст-вакаліст;
2. дуэт, трыа;
3. вакальны ансамбль (ад 4 да 8 чалавек);
3. канферансье.

Незалежна ад намінацыі і ўзроставай катэгорыі журы вызначае Гран-пры фестывалю-конкурсу.

Журы мае права змяняць, падзяляць або не вызначаць лаўрэатаў II і III ступені, а таксама ўзнагароджваць канкурсантаў спецыяльнымі дыпломамі і прызамі:

- за лепшы дэбют;
- за лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумару;
- за лепшы сцэнічны касцюм;
- за лепшае выкананне твора беларускіх аўтараў;
- за лепшае выкананне ваенна-патрыятычнага твору;
- за лепшае выкананне лірыка-патрыятычнага твору;
- самы маленькі ўдзельнік;
- прыз глядацкіх сімпатый;

- за арыгінальнае вядзенне праграмы.

Журы не мае права аб'яўляць вынікі конкурсу да афіцыйнай цырымоніі ўзнагароджання. У спрэчных пытаннях канчатковае рашэнне застаецца за старшынёй журы.

Выступленні канкурсантаў ацэньваюцца па наступных крытэрыях:

- чысціня і выразнасць выканання;
- мастацкі ўзровень рэпертуару;
- сцэнічная культура;
- адпаведнасць рэпертуару ўзросту выканаўцы;
- мастацкае афармленне эстраднага нумару (касцюм, рэжысура і г.д.);
- артыстызм і арыгінальнасць выканання;
- уменне данесці да слухача сэнс выкананага твора;
- культура мовы и сцэнічныя паводзіны (для вядучых);
- выкананне патрабаванняў дадзенай інструкцыі.

Аргкамітэт вызначае прыз глядацкіх сімпатый на падставе галасавання гледачоў і прысутных на фестывалі-конкурсе. Кожны глядач мае права аддаць толькі адзін голас за аднаго з канкурсантаў. Пры наяўнасці некалькіх канкурсантаў з аднолькавай колькасцю аддадзеных галасоў пераможцу вызначае старшыня журы.

Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

## VII. Фінансаванне фестывалю-конкурсу.

Фінансаванне фестывалю-конкурсу ажыццяўляецца аддзелам культуры Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта за кошт сродкаў раённага бюджэту, якія прадугледжаны на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, якія праводзяцца аддзелам на тэрыторыі раёна згодна з зацверджаным каштарысам выдаткаў.

Фінансавыя сродкі, якія паступілі на разліковы рахунак у выглядзе аплаты за ўдзел, выкарыстоўваюцца для пагашэння выдаткаў на арганізацыю і правядзенне фестывалю-конкурсу згодна каштарысу выдаткаў.

Фінансавыя выдаткі на праезд і харчаванне ўдзельнікаў ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

Фінансаванне можа ажыццяўляцца з іншых крыніц, якія не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар дзяржаўнай установы
культуры "Гродзенскі раённы
культурна-інфармацыйны цэнтр" А.А.Грынцэвіч

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення IX адкрытага рэгіянальнага фестывалю-конкурсу эстраднай творчасці дзяцей і моладзі “Вясёлка талентаў”

**СКЛАД АРГКАМІТЭТА**
**IX адкрытага рэгіянальнага фестывалю-конкурсу эстраднай творчасці дзяцей і моладзі “Вясёлка талентаў”**

- **Кузьма Таццяна Мікалаеўна** – начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама;
- **Грынцэвіч Аксана Аляксееўна** – дырэктар дзяржаўнай установы культуры “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”;
- **Шыкаловіч Вольга Алегаўна** – загадчык аддзела метадычнага забеспячэння клубных устаноў і аматарскай мастацкай творчасці дзяржаўнай установы культуры “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”;
- **Сінюціч Кацярына Аляксандраўна** - метадыст па рабоце з калектывамі аматарскай творчасці дзяржаўнай установы культуры “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”;
- **Эйсмант Марта Іосіфаўна** – загадчык Азёрскага цэнтра культуры філіяла дзяржаўнай установы культуры “Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр”.

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення IX адкрытага рэгіянальнага фестывалю-конкурсу эстраднай творчасці дзяцей і моладзі “Вясёлка талентаў”

# СОГЛАСИЕ
## на обработку персональных данных

Я, ____________________________________________________
(фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется)),

___.____._____,
(дата и год рождения),

даю согласие Озерскому центру культуры филиалу государственного учреждения культуры «Гродненский районный культурно-информационный центр» на сбор, систематизацию, хранение, использование следующих персональных данных:

- фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется);
- дата и год рождения;
- место работы или учебы;
- номер телефона;
- e-mail-адрес.
- специальные персональные данные (участие в творческих коллективах);

Обработка моих персональных данных может осуществляться как автоматизированным, так и неавтоматизированным способом.

Согласие на обработку моих персональных данных даю в целях организации и проведения IX открытого регионального фестиваля-конкурса эстрадного творчества детей и молодежи «Вясёлка талентаў».

Согласие предоставлено на срок до 31 марта 2026 года.

Подтверждаю, что до подписания данного согласия мне простым и ясным языком разъяснена информация о моих правах, связанных с обработкой персональных данных, о механизме реализации таких прав, последствиях дачи согласия или отказа в даче такого согласия, а также порядок отзыва согласия: в любое время, подав оператору персональных данных письменное заявление.

___.___.______ __________ ___________________________
(дата) (подпись) (инициалы, фамилия субъекта персональных данных)

СОГЛАСИЕ
на обработку персональных данных

Я, ____________________________________________
(фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) представителя физического лица),

___.____._____,
(дата и год рождения),

являясь законным представителем субъекта персональных данных

____________________________________________
(фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется)),

действующий(ая) от имени субъекта персональных данных на основании
____________________________________________
(вид и реквизиты документа, подтверждающего полномочия представителя)

даю согласие Озерскому центру культуры филиалу государственного учреждения культуры «Гродненский районный культурно-информационный центр» на сбор, систематизацию, хранение, использование следующих персональных данных
____________________________________________:
(фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) субъекта персональных данных),

- фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется);
- дата и год рождения;
- место работы или учебы;
- номер телефона;
- e-mail-адрес.
- Специальные персонавльные данные (участие в творческих коллективах);

Обработка персональных данных может осуществляться как автоматизированным, так и неавтоматизированным способом.

Согласие на обработку персональных данных даю в целях организации и проведения IX открытого регионального фестиваля-конкурса эстрадного творчества детей и молодежи «Вясёлка талентаў».

Согласие предоставлено на срок до 31 марта 2026 года.

Подтверждаю, что до подписания данного согласия мне простым и ясным языком разъяснена информация о моих правах, связанных с обработкой персональных данных, о механизме реализации таких прав, последствиях дачи согласия или отказа в даче такого согласия, а также порядок отзыва согласия: в любое время, подав оператору персональных данных письменное заявление.

| ___.___.______ | __________ | ________________________ |
|---|---|---|
| (дата) | (подпись) | (инициалы, фамилия представителя субъекта персональных данных) |